# Mafia

**Palina**

Мы гуляемся ў Мафію
Каб забыць несусветную лажу
Ўчора хаваўся ў шафе я
Сёння я з шафы вылажу

Ціха ноч падкрадаецца
Коткай пароды корат
Калі засынае горад
Мафія прачынаецца

Цені паўзуць па сцяне
Звабныя, як парнаграфія
Горад залёг у сне
Толькі не дрэмле мафія

З-пад драпежніцкіх іклаў
Сочна пырскае кроў
Горад даўно ўжо звыклы
Губляць сваіх жыхароў

Хтосьці кагось не далічыцца
Хтосьці кагось не даклічацца
Хтосьці кагось не далічыцца
Хтосьці кагось не даклічацца
Але цябе і мяне
Гэта пакуль не датычыцца
Гэта пакуль

Гэта пакуль
Гэта пакуль
Не датычыцца


Sponzor: www.srovnavac.cz - vyberte si pojištění online!